неполитическая доктрина для республик, составивших СССР, определяла в большей степени их формальное участие во многих международных политических акциях [8, с. 22].

**Список использованных источников**

1. Торговые отношения СССР с капиталистическими странами / Науч.-исследовательский ин-т монополии внешней торговли. – М.: Междунар. кн., 1938. – 350 с.
2. Советско-германские отношения от переговоров в Брест-Литовске до подписания Рапалльского договора: сб. док.: в 2 т. / редкол.: С. Дернберг [и др.]. – М.: Политиздат, 1968–1971. – Т. 2: 1919–1922 гг. – 1971. – 596 с.
3. *Кобляков, И. К.* От Бреста до Рапалло. Очерки истории советско-германских отношений с 1918 по 1922 г. / И. К. Кобляков. – М.: Госполитиздат, 1954. – 252 с.
4. История внешней политики СССР. 1917–1985: в 2 т. / под ред. А. А. Громыко. – 5-е изд. – М.: Наука, 1976. – Т. 1: 1917–1945 гг. / ред. А. А. Громыко [и др.]. – 1986. – 536 с.
5. Документы внешней политики СССР: в 24 т. / А. А. Громыко [и др.]. – М.: Госполитиздат: междунар. отношения, 1959–2000. – Т. 5: 1 января 1922 г – 19 ноября 1922 г. / А. Е. Богомолов [и др.]. – 1961. – 807 с.
6. Документы министерства иностранных дел Германского рейха о Белоруссии и ее отношениях с Германией (договоры, меморандумы, информации, переписка и др.): док. на нем. яз. // НАРБ. – Фонд 541. – Оп. 3. – Д. 1.
7. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў: у 3 т. / Пастаян. каміс. Савета Рэсп. Нац. сходу Рэсп. Беларусь па міжнар. справах і нац. бяспецы, М-ва замеж. спраў Рэсп. Беларусь. – Мінск: БелНДІАС, 1997–2001. – Т. 1: 1917–1922 гг. – 1997. – 398 с.
8. *Ковалева, Л. В.* Внешнеполитическая деятельность Советской Белоруссии в 1914–1929 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Л. В. Ковалева; Ин-т истории АН БССР. – Минск, 1993. – 27 с.

**(Дата подачи: 14.02. 2019 г.)**

*Л. В. Мікалаева*
Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники, Минск

*L. Mikalayeva*
Belarusian State University of Informatics and Radioelectronics, Minsk

**УДК [930+327+24](474.5)**

# ПРЫНЦЫПЫ ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ, ПРЫМЯНЯЛЬНЫЯ ДА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XIV – СЯРЭДЗІНЕ XVI СТ.

# PRINCIPLES OF THE HISTORIOGRAPHIC RESEARCH APPLICABLE TO THE STUDY OF THE HISTORY OF FOREIGN POLICY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA

# AT THE END XIV – THE MIDDLE OF THE XVI CENTURY

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя прынцыпы гістарыяграфічнага даследавання (гістарызму, аб'ектыўнасці, сістэмнасці, каштоўнасці ў гісторыі) і іх ужывання да вывучэння гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. Робіцца выснова, што ад выканання патрабаванняў, зыходзячых з дадзеных прынцыпаў, залежыць поспех даследавання.*

*Ключавыя словы: гістарыяграфія; прынцып гістарызму; прынцып аб'ектыўнасці; прынцып сістэмнасці; прынцып каштоўнасці ў гісторыі.*

*The article discusses the basic principles of historiographic research (historicism, objectivity, system, value in history) and their application to the study of the foreign policy of the Grand Duchy of Lithuania at the end of the XIV – middle of the XVI century. It is concluded that the success of the study depends on compliance with the requirements arising from these principles.*

*Key words: historiography; the principle of historicism; the principle of objectivity; the principle of systems; the principle of value in history.*

Адносна даследавання пытанняў эвалюцыі навуковай думкі пры вывучэнні гісторыі знешняй палітыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) перыяду канца XIV – сярэдзіны XVI ст., неабходна адзначыць тую акалічнасць, што метадалагічныя праблемы гістарыяграфіі дадзенай праблемы да нашага часу не атрымалі належнай распрацоўкі. Тлумачэнне такой сітуацыі можна знайсці як у адносна маладым узросце такога навуковага кірунку, як гістарыяграфія, так і ў прычынах дыскрэтнасці (перарывістасці) яго развіцця. Метадалагічныя пытанні гістарыяграфіі нярэдка абазначаліся ў ходзе дыскусій, але іх вырашэння падчас гэтых спрэчак часцей за ўсё не адбывалася. Даводзіцца канстатаваць, што ў спецыяльнай літаратуры складана знайсці абагульняючыя працы, змест якіх прысвечаны пытанням тэарэтыка-метадалагічнай базы, падыходаў і прынцыпаў гістарыяграфічнага даследавання. Адным з выключэнняў, бадай, з'яўляецца праца буйнога спецыяліста ў галіне гістарыяграфіі А. І. Зевелева «Историографическое исследование: методологические аспекты» [1]. У ёй даследчык адзначыў, што метадалогія гістарыяграфіі развіваецца ў цеснай ўзаемасувязі з метадалогіяй гісторыі [1, с. 3]. Калі ж гаворка заходзіць пра знешнюю палітыку дзяржавы, гістарычнае даследаванне рэдка застаецца ў сваіх вузкіх рамках, часцей на практыцы ператвараючыся ў даследаванне гісторыка-палітычнае. Пры гэтым гістарыёграф аказваецца ў сітуацыі полідысцыплінарнасці, што адлюстроўваецца ў разнастайных тэарэтыка-метадалагічных аспектах.

Агульнавядома, што метадалогія гісторыі з'яўляецца своеасаблівым механізмам навуковага пазнання [2, с. 11]. Выбраная метадалогія можа ўплываць на канчатковы вынік у выглядзе пэўнай тэарэтычнай канцэпцыі ці палажэнняў. Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання аказваюць уздзеянне і на выкарыстанне даследчыкамі пэўнага паняційна-катэгарыяльнага апарату. Паняцці і катэгорыі ўтрымліваюць абагульненні,

фіксуюць дасягнутыя вынікі даследавання. Пры вывучэнні пытанняў знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., паняцці і катэгорыі даюць магчымасць перайсці ад эмпірычнага апісання палітычных з'яў і сітуацый да тэарэтычнага тлумачэння гістарычных заканамернасцей. Аднак пры гэтым трэба ўлічваць, што паняцці, катэгорыі могуць выкарыстоўвацца ў якасці інструмента гісторыка-палітычнага аналіза толькі пры ўмове, што яны адэкватна адлюстроўваюць гістарычныя рэаліі палітычнага жыцця дзяржавы на пэўным этапе, што вызначэнне іх даецца не па-за гістарычнай рэальнасцю, не абстрактна, а ў кантэксце яе развіцця і дасягнутага ўзроўню навуковага пазнання.

Разам з тым перад метадалогіяй стаіць і задача па ўдасканаленні паняційна-катэгарыяльнага апарату. Ад ступені яго распрацаванасці і дыферэнцыраванасці залежыць узровень развіцця навукі. Сучасная гістарычная навука удакладняе, узбагачае паняційна-катэгарыяльны апарат гісторыка-палітычнага даследавання, ачышчае яго ад напластаванняў ідэалагічнага дагматызму, палітызаванасці і маралізатарства. У пачатку XXI ст. састарэлыя паняцці замяняюцца агульнапрынятымі ў акадэмічнай навуцы тэрмінамі, хаця працэс гэты нельга прызнаць завершаным.

У свой час А. І. Зевелеў звярнуў увагу на той аспект, што «метадалагічнае асэнсаванне гістрыяграфічных праблем у многім узбагачае і падымае на новы ўзровень разуменне гістарычных падзей, тлумачыць не толькі тое, што адбывалася і адбываецца ў гістарычнай навуцы, але і тое, якімі былі і ёсць яе рухаючыя сілы, а, значыць, як яна развівалася на працягу тысячагоддзяў і працягвае развівацца» [1, с. 3].

Для канкрэтызацыі асноўных аспектаў тэарэтыка-метадалагічнай базы гістарыяграфічнага даследаванне ўдакладнім змест такіх дэфініцый як «метад», «падыход» і «прынцып» навуковага даследавання. Па звестках тлумачальнага слоўніка С. І. Ожэгава, метад – гэта спосаб тэарэтычнага і практычнага даследавання, падыход – гэта сукупнасць прыёмаў, спосабаў пазнання, прынцып – гэта асноўнае, зыходнае палажэнне тэорыі навукі [3, с. 309, 482, 528]. Зыходзячы з такіх тлумачэнняў, можна адзначыць, што паняцці «метад» і «прынцып» носяць аб'ектыўны характар, а паняцце «падыход» – характар суб'ектыўны.

Гістарыяграфія як самастойны кірунак навуковых ведаў валодае ўласнай сістэмай даследчыцкіх прынцыпаў, як агальнанавуковых, так і ўласна гістарычных. Да першай групы адносяцца прынцыпы аб'ектыўнасці [4, с. 148–52; 5, с. 199–202; 2, с. 58–62], гістарызму [4, с. 143–148; 5, с. 194–198; 2, с. 62–65], сістэмнасці [5, с. 198–199; 2, с. 65–66], якія з'яўляюцца абавязковымі для любой навукі. Прынцып каштоўнасці ў гісторыі ці прынцып каштоўнаснага падыхода [4, с. 152–159; 5, с. 202–208; 2, с. 67–68], па словах беларускага метадолага У. Н. Сідарцова, «адносіцца галоўным чынам да гістарычнай навукі, надзяляючы яе самастойнасцю» [2, с. 57], што не з'ўляецца бясспрэчным.

Практыка паказвае, што ў тлумачэнні сутнасці метадалагічных прынцыпаў не заўсёды прысутнічае аднолькавае разуменне іх аўтарамі. Так, у створаных калектывамі аўтараў вучэбных дапаможніках для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў гістарычных і філасофскіх спецыяльнасцей устаноў, забяспечваючых атрыманне вышэйшай адукацыі, адзначаецца, што прынцып гістарызму «патрабуе вывучэння ўсялякай з'явы гісторыі ў яе генезісе і развіцці, канкрэтна-гістарычнай абумоўленасці і індывідуальнасці» [4, с. 143–144; 5, с. 195]. У той час як у аўтарскім курсе лекцый У. Н. Сідарцова прысутнічае, на наш погляд, больш удалая фармуліроўка, якая падкрэслівае, што «…як прынцып пазнання гістарызм мае на ўвазе разгляд аб'екта даследавання ў якасці сістэмы, якая валодае ўнутранай структурай, нацэлены на вывучэнне працэса яго развіцця, выяўленне якасных змен аб'екта, законаў перахода з аднаго стану ў іншы» [2, с. 62]. Характэрна, што У. Н. Сідарцоў з'яўляўся рэдактарам і першых двух вучэбных дапаможнікаў. Невядома, чаму адзначанае розначытанне аказалася па-за ўвагай паважанага рэдактара. Неабходна адзначыць, што менавіта дадзеныя вучэбныя дапаможнікі вельмі часта служаць крыніцай інфармацыі для метадалагічных частак у складзе магістарскіх і кандыдацкіх дысертацый, якія абараняюцца беларускімі навукоўцамі. Некрытычнае трансліраванне звестак з іх сведчыць, у сваю чаргу, аб фармальным падыходзе гісторыкаў да такога важнага складніка метадалагічнага інструментарыя, як прынцыпы даследавання.

Разам з тым сучасны расійскі метадолаг У. Д. Камымнін адзначае, што выкарыстанне прынцыпа гістарызму ў гістарыяграфіі патрабуе абавязковага выканання дзвюх умоў. Па-першае, неабходнасці разглядаць гістарычную канцэпцыю ў развіцці і ў тых канкрэтна-гістарычных умовах, у якіх яна з'явілася. Па-другое, даваць ацэнку гістарычнай канцэпцыі ў параўнанні з папярэднім станам гістарычнай навукі. Гэта, на думку У. Д. Камыніна, «дазваляе выявіць працэс накаплення гістарычных ведаў, вызначыць пераемнасць у развіцці гістарычнай навукі. Пры гэтым нельга ацэньваць гістарычную канцэпцыю з пунка гледжання сённяшнега дня, што непазбежна вядзе да яе мадэрнізацыі» [6, с. 64].

Звяртаючыся да вывучэння працэса зменення навуковай інфармацыі па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., неабходна адзначыць, што, несумненна, прынцып гістарызму мае універсальнае значэнне пры даследаванні азначанай праблемы. Гэта тлумачыцца тымі абставінамі, што менавіта прынцып гістарызму дазваляе разгледзець з'яву ў кантэксце яе развіцця, даследаваць праблему ўдасканалення гістарычных ведаў па знешнепалітычнай гісторыі ВКЛ, складовай часткай якога ў разглядаемы перыяд з'яўляліся беларускія землі, як у храналагічнай паслядоўнасці іх з'яўлення, так і ў дыялектычным адзінстве. Пры гэтым кожны гістарыяграфічны факт, як і іх сукупнасць, аналізуецца у працэсе яго узнікнення, станаўлення, змянення і развіцця, ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. У ходзе аналіза выяўляюцца тэарэтычныя палажэнні,

якія вытрымалі выпрабаванне часам і трывала ўвайшлі ў гістарыяграфію. Пры гэтым з’яўляецца магчымасць вызначыць палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя фактары, якія ўплывалі на станаўленне і развіцце гістарычных ведаў, з’яўленне навуковых канцэпцый. Асобныя ж працы, іх значэнне і месца ў агульнай сукупнасці гістарычнай літаратуры па праблеме ацэньваюцца пры супастаўленні з тэндэнцыямі, ўласцівымі для этапа ці перыяду іх стварэння ў цэлым.

Пры разглядзе пранцыпа аб’ектыўнасці прысутнічае большае адзінадумства. Беларускімі даследчыкамі звярталася ўвага на тое, што для дасягнення ў працэсе гістарычнага пазнання аб’ектыўных ведаў патрабуецца спалучэнне шэрагу фактараў: па-першае, наяўнасць «гістарычных крыніц, якія існуюць незалежна ад даследчыка і ў той ці іншай форме адлюстроўваюць мінулую рэальнасць»; па-другое, зацікаўленасць «даследчыка і грамадства ў цэлым у атрыманні дакладных ведаў пра гісторыю чалавецтва, неабходных для практычнага вырашэння сацыяльных праблем сучаснаці»; па-трэцяе, існаваннем «кантролю аб’ектыўнасці даследавання, дзякуючы агульнаму ўзроўню, дасягнутаму гістарычнай навукай, накопленым у яе арсенале, правераным і абгрунтаваным ведам, існаванню прызнаваемай навуковай супольнасцю сістэмы каштоўнасцей» [4, с. 150; 5, с. 201; 2, с. 58–59]. Таксама было адзначана, што аб’ектыўнасць у працэсе даследавання патрабуе спецыяльнай яго арганізацыі, якая «мае на ўвазе: 1) усебаковы ахоп вывучаемай з’явы з мэтай выяўлення яе сутнасці і разнастайнасці ўзаемасувязей з гістарычным светам; 2) апору на дасягнуты ўзровень навуковых ведаў з улікам пунктаў гледжання, прапанаваных па дадзенай праблеме; 3) творчы падыход да гістарычнага даследавання, што дасягаецца, з аднаго боку, шляхам прымянення ўсёй сукупнасці розных метадаў для атрымання з крыніц максімальна разнастайнай і шырокай інфармацыі пра мінулае, з другога боку – рухам наперад у адпаведнасці з новымі запытамі грамадства і поспехамі, дасягнутымі ў іншых галінах навукі» [4, с. 151; 5, с. 202; 2, с. 60].

Між тым некаторыя расійскія гістарыёграфы выступаюць супраць супраць выкарыстання прынцыпа аб’ектыўнасці. Як адзначае У. Д. Камынін, «аб’ектыўнасць не можа з’яўляцца прынцыпам даследавання. Яна выступае мэтай гістарыяграфічнага даследавання, да дасягнення якой імкнуцца ўсе сапраўдныя даследчыкі» [6, с. 64].

У гістарыяграфічным даследаванні па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. прынцып аб’ектыўнасці патрабуе дыялектычнага падыходу пры аналізе канцэпцый гісторыкаў, выяўлення як станоўчых, так і адмоўных бакоў іх гістарычных прац пры узважанай канкрэтнай пазіцыі навукоўцы ў адносінах да поглядаў і ацэнак даследчыкаў разнастайных аспектаў знешнепалітычнай праблематыкі на розных этапах развіцця гістарычнай навукі. Разглядаючы назапашаны даследчы вопыт па гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., існуе маг-

чымасць абаперціся не толькі на працы аўтараў-гісторыкаў, але і на вялікую колькасць архіўных і апублікаваных крыніц. Правядзенне скрупулёзнай унутранай крытыкі крыніц з мэтай праверкі іх інфармацыі на сапраўднасць таксама адпавядае прынцыпу аб’ектыўнасці, паколькі дазваляе ажыццявіць і верыфікацыю атрыманых даследчыкамі высноў.

У пэўнай ступені развіццём прынцыпа гістарызму з’яўляецца прынцып сістэмнасці. У метадалагічнай літаратуры была звернута ўвага на тое, што сістэмнасць «арыентуе даследчыка на раскрыццё цэласнасці складанага аб’екта, на выяўленне шматлікіх тыпаў сувязей аб’екта вывучэння, спалучэнне іх у адзіную карціну, раскрыццё ўнутраных механізмаў у функцыянаванні аб’екта» [5, с. 198; 2, с. 65]. Пры гэтым сістэмнасць разглядаецца як выключна пазнавальны канструкт, заклікаciv патлумачыць існаванне мноства апісанняў аднаго і таго аб’екта даследавання з-за адрозненняў у пазнавальных устаноўках даследчыкаў [2, с. 65].

Прынцып сістэмнасці дазваляе прадставіць цэласны вобраз гістарыяграфіі гісторыі знешняй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст. як сукупнасці ўзаемазвязаных гістарыяграфічных фактаў, узаемасувязі творчасці розных пакаленняў гісторыкаў.

Да ліку дыскусійных пытанняў адносіцца выдзяленне прынцыпа каштоўнасці ў гісторыі ў якасці менавіта прынцыпа пазнання. Як слушна адзначаюць беларускія аўтары, «паколькі аб’ектам гістарычнага даследавання выступае мінулае чалавечага грамадства, то навуковае яго вывучэнне будзе абавязкова ўключаць у сябе пэўныя адносіны вучонага да прадмета даследавання» [4, с. 152; 5, с. 202–203]. У курсе лекцый У. Н. Сідарцова эпіграфам да параграфа, прысвечанаму прынцыпу каштоўнасці ў гісторыі, прыведзены словы С. П. Рамазанава: «Каштоўнасны падыход існуе аб’ектыўна і засноўваецца на неабходнасці атрымання двух тыпаў інфармацыі аб аб’екце: навуковай і каштоўнаснай» [2, с. 67]. Па словах У. Н. Сідарцова, “прынцып каштоўнасці ў гісторыі нібы аб’ядноўвае і прынцып сістэмнасці, і прынцып гістарызму» [2, с. 58], пры гэтым адзначаецца, што неабходна камбінаваць навуковы падыход, маючы на ўвазе прынцыпы гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці, «і каштоўнасны (у сэнсе надзённасці абранай тэмы даследавання для вырашэння сучасных сацыяльных задач), прынцып каштоўнасці рэальны пры выкананні навуковага падыхода” [2, с. 68]. Такім чынам, як падаецца, аўтарамі не да канца вызначана сутнасць такіх паняццяў як «прынцып гістарычнага пазнання» і «падыход» да гістарычных даследаванняў. У выніку аўтары пры такой падачы інфармацыі падмяняюць паняцці і вызначаюць у якасці «прынцыпа гістарычнага пазнання», які, як адзначалася вышэй, мае аб’ектыўны характар, «падыход» да працэсу даследавання, суб’ектыўны па сваёй сутнасці. Каштоўнасны падыход, безумоўна, мае права на існаванне, але пры ўліку і абавязковым выкарыстанні прынцыпаў гістарызму, аб’ектыўнасці і сістэмнасці.

Каштоўнасны падыход рэалізуецца пры аналізе прац па гісторыі знеш-

няй палітыкі ВКЛ у канцы XIV – сярэдзіне XVI ст., што дазваляе выявіць станоўчыя моманты ў папярэдніх даследаваннях па дадзенай праблеме, вылучыць моманты, якія з’яўляюцца лакунамі ці недастаткова вывучаныя навукоўцамі, вызначыць магчымыя скажэнні ў іх прадстаўленні і прычыны такіх недакладнасцей.

Такім чынам, у наш час многія метадалагічныя аспекты, звязаныя з аналізам і ацэнкай гістарыяграфічных прынцыпаў, сталі прадметам навуковых абмеркаванняў. Пры ўсёй іх дыскусійнасці бясспрэчным з’яўляецца перакананне, што ад выканання патрабаванняў, зыходзячых з дадзеных прынцыпаў, залежыць поспех даследавання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Зевелев, А. И.* Историографическое исследование: методологические аспекты: учеб. пособ. для студ. вузов, обучающихся по специальности «История»/ А. И. Зевелев. – М.: Высш. шк., 1987. – 160 с.

2. *Сидорцов, В. Н.* Методология истории: курс лекций / В. Н. Сидорцов. – Минск, БГУ, 2010. – 207 с.

3. *Ожегов, С. И.* Словарь русского языка: Ок. 57 000 слов / С. И. Ожегов. – 18-е изд., стереотип. – М.: Рус. яз., 1987. – 797 с.

4. Методология истории: учеб. пособ. для студ. вузов / Гуманитар.-экономич. негос. ин-т Республика Беларусь; Белорус. ветвь Ассоц. «История и компьютер»; А. Н. Нечухрин [и др.] / под ред. А. Н. Алпеева [и др.]. – Минск: НТООО «ТетраСистемс», 1996. – 240 с.

55. Методологические проблемы истории: учеб. пособ. для студентов, магистрантов и аспирантов ист. и филос. специальностей учреждений, обеспечивающих получение высшего образования / В. Н. Сидорцов [и др.]; под общ. ред. В. Н. Сидорцова. – Минск: ТетраСистемс, 2006. – 352 с.

8. *Камынин, В. Д.* Теоретические проблемы историографии как научной и учебной дисциплины на рубеже XX–XXI столетий / В. Д. Камынин // Известия Уральского университета. – 2010. – № 3. – С. 54–66.


**(Дата подачи: 18.02.2019 г.)**

*Е. И. Моисеева*
Белорусский государственный университет, Минск

*E. Moiseeva*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(410)**

## ПОЛИТИКА МУЛЬТИКУЛЬТУРАЛИЗМА В ВЕЛИКОБРИТАНИИ В ПЕРИОД ПРАВЛЕНИЯ М. ТЭТЧЕР

## POLICY OF MULTICULTURALISM IN THE GREAT BRITAIN DURING THE GOVERNMENT OF M. THATCHER

*Статья посвящена реализации политики мультикультурализма в период правления администрации М. Тэтчер (1979–1990 гг.). Характерной особенностью данной политики стало реализация закона «О расовых отношениях» 1976 г., согласно которому расизм,*